ПАЛАЖЭННЕ
аб абласным этапе рэспубліканскага творчага
конкурсе юных чытальнікаў “Жывая класіка”

1.Агульныя палажэнні

1.1. Дадзенае Палажэнне вызначае мэты і задачы рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў “Жывая класіка” (далей – Конкурс).

1.2. Конкурс распрацаваны ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб правядзенні рэспубліканскіх мерапрыемстваў установамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з удзелам навучэнцаў, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 06.07.2011 №59.

1.3 Заснавальнікамі Конкурсу з’яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб’яднанне “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, ЗАТ “Сталічнае тэлебачанне”, установа адукацыі “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікам абласнога этапу Конкурса з’яўляецца галоўнае упраўленне па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”.

2. Мэты і задачы Конкурсу

2.1. Конкурс праводзіцца ў мэтах:

павышэння цікавасці дзяцей і падлеткаў да чытання;

развіцця і захавання высокіх маральных каштоўнасцяў і ідэалаў беларускага грамадства;

выхавання падрастаючага пакалення на лепшых узорах нацыянальнай літаратуры;

прыцягнення ўвагі грамадскасці да праблематыкі чытання;

пашырэння чытацкага кругагляду;

пошуку і падтрымкі таленавітай моладзі.

2.2. Конкурс прысвечаны 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Вялікая Перамога – гэта не проста дата ў календары, гэта сімвал усяго таго, што мы набылі, дзякуючы самаадданасці і гераізму абаронцаў Айчыны. І пакуль жывуць успамінамі, пакуль перадаюцца аповеды сведкаў таго часу, мы памятаем, што мір і спакой – самае каштоўнае ў свеце. Згуртаваныя агульнай мэтай, пакаленне за пакаленнем працягваюць несці ў сэрцах цеплыню сяброўства і любоў да роднай зямлі, веру ў светлую будучыню і павагу да продкаў, гэта дапамагае нам памятаць, што вайна – гэта не толькі пакуты, але і перамога чалавечага духу.

Лепшыя творы беларускай нацыянальнай літаратуры – найважнейшы сродак духоўнага развіцця, скарбніца гісторыі народа, вялікая энцыклапедыя жыцця, у якой ёсць старонкі, прысвечаныя як гераічнаму мінуламу, так

і працы, шчаслівай будучыні, сяброўству, вучобе і добрым справам дзяцей і моладзі, якія ганарацца сваімі гераічнымі прадзедамі.

3. Парадак і ўмовы правядзення Конкурсу

3.1 Конкурс праводзіцца сярод навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, наступных узроставых груп:

1-4 класы;

5-6 класы;

7-8 класы;

9-10 класы.

3.2. У склад журы конкурсу на ўсіх этапах ўваходзяць вядомыя дзеячы культуры і мастацтва, настаўнікі, бібліятэкары, пісьменнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і аб’яднанняў.

3.3 Конкурс праводзіцца ў пяць этапаў.

Першы этап – з 7 па 21 красавіка 2025 года ва ўстановах агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Колькасць удзельнікаў не абмяжоўваецца.

Удзельнікі выконваюць два розныя па жанры тэматыцы творы беларускай нацыянальнай літаратуры.

Агульная працягласць выступлення – 6 хвілін.

**Не дапускаецца паўтор літаратурнага матэрыялу, выкарыстанага пераможцамі мінулага года, спіс твораў (дадатак 2)*

1. Аркадзь Куляшоў “Маці”

2 Кандрат Крапіва “Мурашка і жук”

3 Пятрусь Броўка “Спакуса”

4 Кандрат Крапіва “Лётчык і блыха”

5 Янка Маўр “Максімка”

6 Алег Лойка “Юнак быў з-пад Слоніма родам”

7 Уладзімір Корбан “Гуркі”

8 Алёна Васілевіч “Мая ідылія”

9 Алесь Савіцкі “Яўгенка, Лінда і Рык”

10 Ганна Міклашэвіч “За цябе, мая вёска, малюся”

11 Пятрусь Броўка “Сыны”

12 Аркадзь Куляшоў “Сцяг брыгады” (урывак з паэмы)

13 Янка Купала “Прымакі” (урывак з п’есы)

14 Канстанцыя Буйло “Я ганаруся да вас….”

15 Анатоль Бялевіч “Смерць Маланні…”

Творы і манеры выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка. Пераможцы прымаюць удзел у раённым этапе Конкурсу.

Другі этап (раённы) – з 21 па 30 красавіка 2025 года раённымі ўстановамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Удзельнікі выконваюць два

розныя па жанры тэматыцы творы. Агульная працягласць выступлення – 6 хвілін. Творы і манеры выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка.

Пераможцы раённага этапу Конкурсу, якія занялі першыя месцы ў кожнай узроставай групе, прымаюць удзел у абласным этапе Конкурсу.

На абласны этап дасылаецца:

агульная заяўка ад раёна з спасылкай на відэазапіс выступленняў канкурсантаў,

пратакол паседжання журы раённага (гарадскога) аргкамітэта,

манітрорынг удзелу у Конкурсе раённага, адборачнага этапаў,

на электронную пошту cmt@brest.by з пазнакай “Жывая класіка” для аддзела мастацкай творчасці” УА “БДАЦМТ” да 30 красавіка 2025 года.

Трэці этап (абласны) – з 2 па 31 мая 2025 года (падводзяцца вынікі абласнога этапу). Удзельнікі выконваюць два розныя па жанры тэматыцы творы. Агульная працягласць выступлення – 6 хвілін. Творы і манеры выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка. Пераможцы абласнога этапу Конкурсу ў кожнай узроставай групе прымаюць удзел у паўфінале.

Чацвёрты этап (паўфінал) – праводзіцца з 1 па 25 чэрвеня 2025 года арганізатарамі Конкурсу. Удзельнікі выконваюць адзін з твораў трэцяга этапа. Агульная працягласць выступлення – да 4 хвілін. Творы і манеры выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка.

Пяты этап (фінал) – праводзіцца арганізатарамі Конкурсу ў рамках мерапрыемстваў Дня беларускага пісьменства.

У фінале прымаюць удзел пераможцы паўфіналу. Удзельнікі выконваюць адзін твор. Агульная працягласць выступлення – да 4 хвілін.

3.4. На кожным этапе Конкурсу вызначаецца па аднаму пераможцу ў кожнай узроставай катэгорыі.

3.5 Конкурсныя выступленні ацэньваюцца адпаведна з крытэрыямі ад 0 да 10 балаў.

3.6 Аргкамітэт конкурсу пакірае за сабой права ўсе матэрыялы (відэа і друкаваная прадукцыя), створаныя ў перыяд правядзення конкурсу, выкарыстоўваюць на мерапрыемствах некамерцыйнага характару.

3.7 Арганізатары конкурсу маюць права на апрацоўку персанальных дадзеных удзельнікаў (публікацыю спісаў пераможцаў і прызёраў, выданне дыпломаў, афіш і г.д.). Удзел у конкурсе азначае аўтаматычную згоду ўдзельнікаў і іх афіцыйных прадстаўнікоў з умовамі конкурсу і з правамі арганізатараў на апрацоўку персанальных дадзеных.

4. Журы Конкурсу

4.1. У склад журы Конкурсу на ўсіх этапах ўваходзяць вядомыя дзеячы культуры і мастацтва, настаўнікі, бібліятэкары, пісьменнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і аб’яднанняў.

4.2. Крытэрыі ацэнкі выступлення (паказчыкі – балы): ад 0 да 10

- узровень выканальніцкага майстэрства;

- выбар тэксту твора;
- пачуццё жанравай асаблівасці;
- творчы патанцыял

5. Узнагароджанне пераможцаў Конкурсу

5.1. Пераможцы абластнога этапу Конкурса узнагароджваюцца дыпломамі першай, другой і трэцяй ступеняў галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама.

Усе ўдзельнікі паўфіналу Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэатаў Конкурсу, дыпломамі пераможцаў першай, другой і трэцяй ступеняў адпаведна і кааштоўнымі падарункамі ад заснавальнікаў конкурсу.

5.2. Пераможцы рэспубліканскага Конкурсу ўзнагароджваюцца пуцёўкай у Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр “Зубронак”.

6. Інфармацыйнае забеспячэнне Конкурсу

6.1 Этапы правядзення Конкурсу шырока асвятляюцца ў сродках масавай інфармацыі.

6.2. Інфармацыйнымі партнёрамі Конкурсу з'яўляюцца: “Выдавецкі дом “Звязда”, часопісы “Вясёлка”, “Бярозка”, “Качели”, “Зорька”, “Рюкзачок” і іншыя СМІ (па ўзгадненню з заснавальнікамі).

6.3. На працягу правядзення этапаў Конкурсу здымаюцца сюжэты і дэманструюцца ў эфіры нацыянальных і рэгіянальных тэлеканалаў.

Тэлеверсія фіналу Конкурсу транслюецца асобнай праграмай у эфіры ЗАТ “Сталічнае тэлебачанне”.

7. Фінансаванне Конкурсу

7.1. Фінансаванне Конкурсу забяспечваецца заснавальнікамі Конкурсу за кошт бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў.

7.2. Могуць выкарыстоўвацца іншыя крыніцы фінансавання ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

8. Дадатковая інфармацыя Конкурсу

Агульная заяўка
на ўдзел у абласным этапе рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў
“Жывая класіка”

№ п/п	Узроставая катэгорыя	Прозвішча, імя, імя па бацьку	Назва ўстановы адукацыі	Прозвішча імя, імя па бацьку педагога, кантактны тэлефон	Аўтар і назва твора	Спасылкі на відэа	Звесткі аб удзельніку, якія перашкаджаюць удзелу ў конкурсе

1	1-я узроставая катэгорыя (пачатковыя класы)						
2	2-я узроставая катэгорыя (5-6 класы)						
3	3-я узроставая катэгорыя (7-8 класы)						
4	4-я узроставая катэгорыя (9-10 класы)						

Маніторынг
удзелу ў рэспубліканскім творчым конкурсе юных чытальнікаў
“Жывая класіка”

Этапы	Колькасць удзельнікаў (з іх – навучэнцы ўстаноў дадатковай адукацыі)	Колькасць аб’яднанняў па інтарэсах (з іх – устаноў дадатковай адукацыі)	Еолькасць устаноў адукацыі (з іх – устаноў дадатковай адукацыі)
Раённы (гарадскі)			
Абласны			

**Не дапускаецца паўтор літаратурнага матэрыялу, выкарыстанага пераможцамі мінулага года*

СПІС ТВОРАЎ
выкарыстаных пераможцамі рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў
“Жывая класіка 2024”

№ п/п	Аўтар	Назва твора
1	Аркадзь Куляшоў	“Маці”
2	Кандрат Крапіва	“Мурашка і жук”
3	Пятрусь Броўка	“Спакуса”
4	Кандрат Крапіва	“Лётчык і блыха”
5	Янка Маўр	“Максімка”
6	Алег Лойка	“Юнак быў з-пад Слоніма родам”
7	Уладзімір Корбан	“Гуркі”
8	Алёна Васілевіч	“Мая ідылія”
9	Алесь Савіцкі	“Яўгенка, Лінда і Рык”
10	Ганна Міклашэвіч	“За цябе, мая вёска, малюся”
11	Пятрусь Броўка	“Сыны”
12	Аркадзь Куляшоў	“Сцяг брыгады” (урывак з паэмы)
13	Янка Купала	“Прымакі” (урывак з п’есы)
14	Канстанцыя Буйло	“Я ганаруся да вас….”
15	Анатоль Бялевіч	“Смерць Маланні…”

Крытэрыі ацэнкі выступлення ўдзельнікаў
рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў “Жывая класіка”

№ п/п	Крытэрыі	Балы
1	узровень выканальніцкага майстэрства	ад 0 да 10
2	выбар тэксту твора	ад 0 да 10
3	пачуццё жанравай асаблівасці	ад 0 да 10
4	творчы патанцыял	ад 0 да 10